ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ

ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ

Орган Віцебскага АК КП(б)Б, гарсавету і гарпрафсавету.

№ 86 | ПЯТНІЦА, 14 КРАСАВІКА 1933 г. | № 86

Москва, Старая пл. Информ. отд. ЦК ВКП(б) 1 экз.

Па Савецкім саюзе.

31 МТС скончылі сяўбу раньніх.

Ічкінская, Іслам-Цераксская, Курманская, Ак-Мечацкая, Колайская, Сьмідовіцкая, Сакская, Біюк-Анларская Семікаладзеянская Еўпаторыйская, Сымфэропальская, Балаглаўская (Крым), Грэйгоўская (Перасалаўская), Скадоўская, Міхайлаўская, Каланчакская, Нова-Паўлаўская, Харлоўская, Чаплынская, Бэктарская, Чулакаўская, Гросьлібэктальская, Грамоўская (Адэская вобласьць), Мэлітопальская, Чахаградзкая, Варвараўская (Дняпропятроўская вобласьць), Анарская, Крэснагвардзейская (Адыгея), Пашкоўская, Вялічкаўская, Грозьненская (Паўночны Каўказ).

ПА БССР.

Аднагадовыя курсы старшынь і сэкратароў сельсаветаў.

Курсы арганізоўваюцца ў Менску па пастанове прэзыдыуму ЦВК БССР. Пры курсах адчыняецца аддзяленьне па пэрападрыхтоўцы работнікаў сельсаветаў, якія кожныя тры месяцы будуць выпускаць 450 чалавек.

1-га ліпеня—пуск Гомельскай мэханізаванай гуты.

У Гомелі заканчваецца будаўніцтва буйнейшай у БССР мэханізаванай гуты. Тэрмін пуску вызначан Наркамцёгпрамам 1 ЛІПЕНЯ 1933 ГОДУ. Прадукцыйнасьць заводу—30.000 тон ваконнага шкла ў год, або ў паўтары разы больш, чым даюць цяпер усе гуты БССР.

Гута абсталявана 25 машынамі аўтаматамі „Фурко". Агульны кошт будаўніцтва 18.600 т. р.

Майская сэсія Акадэміі Навук.

У маі ў Менску склікаецца чарговая сэсія Акадэміі Навук Беларусі.

Сэсія абмяркуе пытаньні аб праблеме Вялікага Дняпра на тэрыторыі БССР, аб выбарах новых акадэмікаў і зацьвердзіць статут Акадэміі.

З дакладам аб праблеме Вялікага Дняпра выступяць акадэмікі т. т. ДОМБАЛЬ і ПЯТРОВІЧ

Здраўніцы для асьветнікаў.

Чатыры здраўніцы для асьветнікаў Беларусі па 200 месц кожная будуецца ў Менску, Гомелі, Магілёве і Віцебску.

РАБКОРЫ! АКАЖЭЦЕ ШТОДЗЁННУЮ ДАПАМОГУ КАЛГАСНЫМ НАСЬЦЕНГАЗЭТАМ І СЕЛЬКОРАМ!

Сёньня зьбіраецца агульнагарадзкі зьлёт рабкораў, які абгаворыць важнейшыя ў сучасны момант пытаньні ўдзелу бальшавіцкага друку ў пасеўнай кампаніі.

Прамова тав. Постышава на Харкаўскім абласным зьезьдзе рабселькораў, перадавы артыкул „Правды", кіруючы артыкул старшыні ЦКК КП(б)Б т. Лычова, пастанова гаркому партыі аб узмацненьні нізавога вясковага друку—узброіваюць нашу партарганізацыю і рабселькораўскі рух чоткімі дырэктывамі, кіруючыся якімі мы абавязаны забясьпечыць актыўны ўдзел рабкораў, селькораў, насьценгазэт і ўсёй сеткі друку ў барацьбе за бальшавіцкае правядзеньне сяўбы. Роля рабселькораў у гэтай справе—вельмі вялікая і адказная. Іх роля—„гэта жгучая, бязьлітасная, неўмалімая, дзелавая ленінская крытыка і адначасова з гэтым бальшавіцкая актыўнасьць у вырашэньні практычных задач калгаснага будаўніцтва, прыклад калгаснай працы". (Постышаў).

Трэба прама сказаць, што кіраўніцтва рабселькорамі у нас на Віцебшчыне значна паслабла. Вельмі мала займаюцца, а мясцамі зусім не займаюцца, справамі нізавога друку і селькораў нашы сельскія парт'ячэйкі. Вельмі агульна, малаканкрэтна кіраўніцтва партколектываў. Вельмі слабэ кіраўніцтва селькораўскім рухам з боку „Віцебскага пралетара" які, як орган гаркому партыі, абавязаны ажыцьцяўляць непасрэднае і арганізацыйнае і палітычна-выхаваўчае кіраўніцтва масамі рабкораў і селькораў. УСТАНАВІЦЬ І ЗАМАЦАВАЦЬ БАЛЬШАВІЦКАЕ КІРАЎНІЦТВА СЕЛЬКОРАЎСКІМ РУХАМ У КОЖНЫМ ЯГО ЗЬВЯНЕ—гэта першая ўмова, ажыцьцяўленьне якой гарантуе правільнае і найазялікшае скарыстаньне друку—„самай вострай, самай моцнай зброі партыі".

Пастанова ГК КП(б)Б ад 4 красавіка вызначыла практычныя мерапрыемствы па ўзмацненьні парткіраўніцтва нізавым вясковым друкам і селькорамі. Робячы асноўны ўпор на парт'ячэйку, устанаўліваючы першым непасрэдным зьвяном кіраўніцтва ячэйковага парт-арганізатара па друку, гарком партыі ўсклаў сур'ёзнейшыя абавязкі на вытворчыя парткалектывы, на шматтыражкі і насьценгазэты прадпрыемстваў. Яны абавязаны забясьпечыць такую пастаноўку ШЭФСКАЙ РАБОТЫ, каб у падшэфных ім сельсаветах і калгасах нізавы друк і селькоры РАБОТАЛІ ПА-БАЛЬШАВІЦКУ.

Там, дзе няма бальшавіцкага партыйнага кіраўніцтва, дзе ў мясцовых работнікаў настолькі страчана рэвалюцыйная пільнасьць, што яны пакінулі насьценгазэты на самацёк, на „волю лёсу", там адкрываюцца шырокія магчымасьці для клясавага ворага прыбраць у свае рукі гэтую моцную зброю. Дзейнічаючы ціхай сапай, падкапваючыся пад калгаснае будаўніцтва а падцінка, маскуючыся ў прывержанца калгасу, але толькі не бальшавіцкага, кулацкія, вароўскія, эсэраўскія, нацыяналістычныя элементы імкнуцца пралезьці ў рэдкалегіі калгасных газэт, каб прыкрываючыся маскай селькора, стварыць бясьпеку для сябе і сваіх саўчасьнікаў па шкодніцтве ад крытыкі, ад разаблачэньня. Гэта мы бачылі на прыкладзе насьценгазэт «СІЛАЧА». Даўжанскага сельсавету (Корнышаў, Бароўскі), ІМЯ ЧАРВЯКОВА, Віцебскага сельсавету (Малахоўская, Якімава), гэта мы бачылі на прыкладзе тых газэт, якія моўчкі абыходзілі кулацкія махінацыі („НОВЫ СЬВЕТ"—Міхалёўскага сельсавету; «КУЛЬТУРНЫ ФРОНТ»—В.-Лётчанскага, «ПАРЫСКАЯ КАМУНА»—Шумнянскага), альбо прама праведвалі „дружную сям'ю" ў калгасе разам з кулаком, лодырам, шкодзікам (БАБІНІЦКІ сельсавет).

Наша задача—разаблачыць кулака пад маскай ілжэселькора, выжыць яго з селькораўскіх радоў, забясьпечыць такі склад рэдкалегіі, які-б быў лепшым дапаможнікам партыі ў барацьбе за пераўтварэньне кожнага калгасу ў бальшавіцкі калгас.

Селькораўскі рух—гэта магутны сродак высоўваньня і выхаваньня шырокага беспартыйнага актыву калгасьнікаў-ударнікаў. «Адвінь усялякія апасеньні пансаваць добрасуседзкія адносіны і грамі злодзеяў, прыхлябацеляў, лодыраў, адкрой бязьлітасны агонь на расхлябанасьці і парушэньнях працоўнай дысцыпліны, па тых, хто сее з агрэгамі, хто больш адпачывае, чым працуе, хто злачынна адносіцца да жывога і мёртвага інвэнтара калгасу».—з гэтай пуцёўкай тав. Постышава рабкораўская маса павінна зьвязацца з селькораўскім рухам, накіроўваць яго па гэтым бальшавіцкім шляху. Вострая бальшавіцкая крытыка павінна быць накіравана на выкрыцьцё клясава-варожых элемэнтаў і іх махінацый, з аднаго боку, і на дапамогу нашым кадрам калгасных кіраўнікоў і актывістам накапляць гаспадарчы вопыт, выпраўляць дапушчаныя недахопы і памылкі—з другога.

Сёньняшні зьлёт рабкораў павінен практычна абгаварыць шляхі і мэтады выхаваўчага пралетарскага ўплыву шэфаў на работу вясковага друку, іх уплыву ва ўмацаваньні калгаснага друку, ва ўзмацненьні ролі газэт і селькораў у барацьбе за бальшавіцкую сяўбу.

СПАБОРНІЦТВА ТРОХ РАЁНАЎ: МЕНСК, ВІЦЕБСК, ГОМЕЛЬ.

ПРАВЕСЬЦІ СЯЎБУ ДАКЛАДНА Ў ВЫЗНАЧАНЫ ТЭРМІН

можна пры ўмове поўнага выхаду ўсіх калгасьнікаў і калгасьніц у поле.

У дапамогу паляводчай брыгадзе.

КАЛІ ТРЭБА СЕЯЦЬ КАНЮШЫНУ.

Амаль-што кожны калгасьнік ведае, якую карысьць прыносіць гаспадарцы канюшына. Яна, па-першае, дае вялікую колькасьць добраякаснага корму—да 50 цэнтнэраў і больш з га. Сена канюшыны ідзе, як лепшы корм коням, буйнай рагатай жывёле і сьвіньням. Канюшынныя выпасы зьяўляюцца лепшымі выпасамі для жывёлы, асабліва для гадоўлі сьніней. Поле пасьля канюшыны запраўляецца азоцістым угнаеньнем. Глеба набывае дробна зярністую пабудову. Бульба, лён, жыта і інш. пасьля канюшыны добра растуць. Канюшына зьяўляецца лепшым папярэднікам для тэхнічных збожжавых культур, кораньплодаў, клубняплодаў і інш.

Атрыманьне карысьці ад канюшыны шмат залежыць ад тэрміну сяўбы канюшыны. Вядома, што канюшына падсяваецца пад азімыя культуры: жыта, пшаніцу, і яравыя: авёс і ячмень Але лепш за ўсё сяўбу канюшыны праводзіць па азімых як мага раней, калі глеба яшчэ вадкая. Для гэтага выбіраюць марозны дзень, каб менш пашкодзіць жыту, і праводзяць сяўбу.

Пераважнасьць раньняй сяўбы канюшыны па азімых супроць позьняй сяўбы, альбо па яравых культурах, наступная:

1. Пры раньняй сяўбе ўраджай канюшыны значна вышэй, чым ад пасеву па азімых у позьнія тэрміны, калі глеба прасохне. Гэта тлумачыцца тым, што пры сяўбе ў вадкую глебу процант усхожасьці канюшыны значна вышэй, так як амаль усё насеньне пападае ў зямлю, у той час, як пры сяўбе ў прасохшую зямлю вялікая колькасьць насеньня застаецца на паверхні глебы.

2. Раньняя сяўба канюшыны дае магчымасьць ужо ў год сяўбы атрымаць добры ўраджай. Летась у калгасе „Замасточча", Замастоцкага сельсавету, у брудналалую зямлю па азімых культурах было засеяна 12 га канюшыны. Рост канюшыны быў такі, што калгас скасіў яе, атрымаўшы каля 600 цэнтн. добраякаснага сена. Каб не сапсаваць канюшыны, калгас зжаў сарпамі азімае, а потым масаркай скасіў канюшыну.

3. Раньняя сяўба канюшыны дае магчымасьць калгасу да масавага выхаду ў поле вызваліць рабочыя рукі ад часткі сяўбы і перакінуць іх на ворыва.

Вось тыя пераважнасьці, якія дае сяўба канюшыны па азімых культурах у брудналалую зямлю. Але ня выключана магчымасьць, што згодна ўстаноўленага севазвароту ў калгасе канюшыну прыдзецца сеяць па яравых культурах. У такіх выпадках сяўбу канюшыны па аўсе і ячмені трэба праводзіць зараз жа пасьля сяўбы гэтых культур.

Самая лепшая глеба для сяўбы канюшыны—сярэдняя суглінкі.

Калі канюшынай мяркуецца карыстацца два і больш год, неабходна высяваць яе ў мяшанцы з цімафеўкай, пры чым цімафеўкі дадаецца 4 кілёграмы на 1 га.

Вясной, у наступным пасьля пасеву годзе, як толькі прасохне глеба, трэба правесьці баранаваньне канюшыны ў 2—3 сьляды. Ад баранаваньня павялічваецца ўраджай. Рэшткі іржышча, якія выбраны бараной, возяцца з поля.

Усе пераважнасьці за раньняй сяўбой канюшыны. Да масавага выхаду ў поле сяўба канюшыны павінна быць скончана цалкам.

Д. Т.

Лепшыя аднаасобнікі ўступаюць у калгасы.

СТАРАСЕЛЬСКІ СЕЛЬСАВЕТ. (Па тэлефоне ад нашага спэцкора).

У першыя дні выезду ў поле па калгасах сельсавету маецца прыліў за кошт лепшых працоўных аднаасобнікаў. За апошнія дні па сельсавеце прынята 13 аднаасобных гаспадарак.

Грынман.

Там, дзе дрэнны конюх,—там коні не гатовы да сяўбы.

Толькі ў апошні час, дзякуючы добраму догляду новага конюха Шчыглова Базыля, коні ў стайні Рудакі (калгас «Дырыжабль», Рудакоўскага сельсавету) значна палепшыліся і маюць добры выгляд. Стайня абсталявана добра.

Зусім іншы малюнак у стайні Ступішча Там і па сёньняшні дзень конюхам працуе Севастопалеў Сямён, якому за дрэнны догляд за коньмі дана апошняе папярэджаньне. Тут коні абязьлічаны, карыстаньне імі беспарадачнае, у 4-х коняй зьбіты сьпіны. Ня рыхтуюць каня да сяўбы і ў брыгадзе Якушы. Тут 5 коняй змораныя і худыя. У стайні Камары, дзе раней коні былі самыя лепшыя, зараз, у сувязі з непамернай нагрузкай на каня, выгляд іх значна пагоршыўся.

У час пробнага выезду высьветлілася, што яшчэ не адрамантавана 50 проц. дзілег. У брыгадзе Ступішча не адсартавана насеньне. Абмен лішкаў на нехапаючае насеньне яшчэ поўнасьцю ня зроблен. Тною ня вывезена 543 вазы.

Урокі пробнага выезду калгасьнікамі ўлічаны. Прымаюцца практычныя меры, каб поўнасьцю забясьпечыць пасеўную плошчу насеньнем, адрамантаваць дзілегі і поўнасьцю вывезьці гной. Настрой калгасьнікаў добры і яны запэўніваюць, што прарывы да выхаду ў поле будуць ліквідаваны.

Н.

УЧОРА НА ПАЛЁХ.

(ПА ПАВЕДАМЛЕНЬНЯХ НАШЫХ КАРЭСПАНДЭНТАЎ, СЕЛЬКОРАЎ, СТАРШЫНЬ СЕЛЬСАВЕТАЎ І СЭКРАТАРОЎ ПАРТ'ЯЧЭЕК).

МАШКАНСКІ СЕЛЬСАВЕТ.

УЗЯТЫЯ АБАВЯЗКІ КАЛГАС ВЫКОНВАЕ.

Калгасам імя Сталіна за 11 красавіка ўзарана 10 га—па брыгадах Ярошкі, Кебеля і Мацьвеева. Якасьць ворыва добрая, без агрэхаў. Калгас імя Сталіна выконвае ўзятыя на сябе абавязкі ў спаборніцтве з калгасамі Замастоцкага сельсавету на хутчэйшае і добраякаснае правядзеньне веснавой сяўбы.

Зэліксон.

ШУМНЯНСКІ СЕЛЬСАВЕТ.

АВЁС НЕ ЗАБАРАНАВАЛІ.

Калгас імя Будзённага ў гэтым годзе вытварыў звышраньнюю сяўбу: аўсу 0,25 га, ільну—0,12 га і засеяў 0,5 га канюшыны. Сяўба скончана 4 красавіка, але да гэтага часу авёс застаўся незабаранаваным. На полі, засеяным аўсом, зьявілася мноства варон, якія выклёўваюць зерне аўсу.

Кіраўнікі калгасу не дадумаліся своечасова паставіць пугала на полі. Нягледзячы на тое, што грэбні ворыва ўжо прасохлі, авёс не забаранавалі.

Рыг. Вярхоўскі.

РУДАКОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ.

ПАЧЫНАЮЦЬ РАНЬНЮЮ СЯЎБУ ЯРАВЫХ.

Калгасы сельсавету пачынаюць раньнюю сяўбу яравых.

Калгас «Шлях да сацыялізму» засеяў 0,5 га ільну, калгас імя Дзяржынскага засеяў 2 га канюшыны і падняў 1 га пахаці.

Па ўсіх калгасах ідзе падрыхтоўка да агульнага выхаду ў поле.

Старшыня сельсавету Кербэль.
Выязная рэдакцыя „В. П."—Раскін.

ЯЛАГІНСКІ СЕЛЬСАВЕТ.

ЦІ НЯ СТАЎКА ГЭТА НА КАМПРАМЭТАЦЫЮ ЗВЫШРАНЬНЯЙ СЯЎБЫ?

Звышраньнюю сяўбу ільну пачалі калгасы «Капачова» і «Барацьбіт». Калгас «Капачова» засеяў 0,25 га, «Барацьбіт»—0,5 га. Па настаяньні вучастковага агранома МТС Камянецкага, у абодвух калгасах сяўба праводзілася па неўзараным бульбяніішчы, а ў калгасе „Барацьбіт"—нават на неўзараным канюшынішчы. Гэты гора-агранам ня ўцяміў таго, што звышраньнюю сяўбу ільну можна праводзіць толькі па зяблевым ворыве.

Азаронак.

АД РЭДАКЦЫІ. Ці не зьяўляецца «парада» агранома Камянецкага стаўкай на кампрамэтацыю звышраньняй сяўбы? Мы спадзяемся, што дырэкцыя МТС зараз-жа займецца высьвятленьнем гэтага факту і прымае належныя захады.

ВІЦЕБСКІ СЕЛЬСАВЕТ.

КОРМЫ ВЫПРАЦОЎКІ ВЫКОНВАЮЦЦА.

У калгасе „Шлях да сацыялізму" засеяна 1,5 га канюшыны, узорана—2 га. Нормы выпрацоўкі выконваюцца.

У Калгасе «Іскра» ўзорана канюшынішча 2,74 га, засеяна канюшыны—3 га.

Сэкратар парт'ячэйкі Рыжы.

СЯЛЮЦКІ СЕЛЬСАВЕТ.

ПАЧАЛІ ПРАТРУЧВАНЬНЕ НАСЕНЬНЯ.

Кладаўшчыца калгасу імя Варашылава Красоўская пачала сухое пратручваньне насеньня яравых збожжавых культур. Ужо пратручана 4 цэнтнэры яравой пшаніцы.

Сіпко.

Камсамолец Паўлаў Кірыл ня ўдзельнічае падрыхтоўцы да сяўбы.

Пачалі вялікую работу па падрыхтоўцы да севу камсамольцы калгасу «Дырыжабль», Рудакоўскага сельсавету.

Арганізаваная брыгада абходам па хатах калгасьнікаў сабрала каля 4-х цэнтн. попелу. Асабліва праявілі сябе ў гэтай рабоце брыгадзір гаркому КСМ тав. Сазоненка і члены ячэйкі Паўлаў Андрей, Паўлаў Алесь, Салаўёў В. і Паўлаў Я.

Толькі адзін ня ўдзельнічаў—гэта камсамолец Паўлаў Кірыл. Сваёй бязьдзейнасьцю і наогул нежаданьнем змагацца за посьпех сяўбы ён фактычна дапамагае кулаку. Такім ня месца ў радах камсамолу.

Камсамолец.

Пасевы ільну і канапель страхуюцца дармова ад засухі.

Паводле пастановы Савету працы і абароны ад 25 лютага 1933 г. і СНК БССР і ЦК КП(б)Б ад 12 сакавіка г. г. аб кантрактацыі ільну і канапель ураджаю 1933 г. пасевы ільну і канапель гэтага году калгасаў і аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак падлягаюць дармоваму акладному страхаваньню ад засухі.

ПА-БАЛЬШАВІЦКУ ПРАВЕСЬЦІ ГАРОДНЮЮ СЯЎБУ.

КІРАЎНІЦТВА ШВЭЙНАЙ ФАБРЫКІ „СЬЦЯГ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ" НЯ КІРУЕ ПРЫГАРАДНАЙ ГАСПАДАРКАЙ ПРАДПРЫЕМСТВА.

Каапгасу „Новы шлях" патрэбна дзейсная дапамога.

Каапгас фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі»—«Новы шлях» дрэнна рыхтуецца да гародняй сяўбы.

На сёньняшні дзень яшчэ ня вывезена на палі 800 тон угнаеньня, не хапае 40 рабочых для палявых работ. Да пачатку сяўбы засталіся літаральна лічаныя дні, але-ж дырэкцыя яшчэ ня склала вытворчага пляну і не разьмеркавала наяўнай рабочай сілы па брыгадах. Не хапае насеньня: аўсу—30 цэнтнэраў, вікі—20 цэнтн., гароху—7,5 цэнтнэраў.

Досыць указаць на гэтыя факты, каб зразумець, што калі ня будуць прыняты энэргічныя меры па ліквідацыі прарыву ў падрыхтоўцы гаспадаркі да сяўбы і калі гаспадарцы ня будзе аказана дзейсная дапамога, то сяўба будзе пастаўлена пад пагрозу зрыву.

Што-ж робяць фабрычныя арганізацыі і адміністрацыя самога каапгасу, каб ліквідаваць прарыў, што робяць гаспадарчыя кіраўнікі фабрыкі, каб забясьпечыць посьпех сяўбы? На жаль, вінаваты! І дырэктар фабрыкі т. Каган, і праўленьне ЗРК, і фабком—усе яны не адчуваюць н і я к а й а д к а з н а с ь ц і за становішча гаспадаркі. Мы не памылімся, калі скажам, што і ДЫРЭКТАР ФАБРЫКІ тав. КАГАН, І СТАРШЫНЯ ФАБКОМУ тав. ЖУТЧАНКА Ў ГАСПАДАРЦЫ АМАЛЬ НЯ БЫВАЮЦЬ. Пачуцьцё самаўспакаеньня, спадзяваньні на самацёк—вось, што характарызуе адносіны тт. Кагана і Жутчанкі да сяўбы ў каапгасе „Новы шлях".

Дырэктар фабрыкі т. КАГАН, кіраўнік аддзелу рабочага снабжэньня т. ЦЫПКІН, старшыня праўленьня ЗРК т. КАЦ, старшыня фабкому т. Жутчанка мусіць забылі, што паводле пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б, ЯНЫ, ЯК КІРАЎНІКІ ФАБРЫКІ, НЯСУЦЬ ПЭРСАНАЛЬНУЮ АДКАЗНАСЬЦЬ ЗА ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНУ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАГА ЦЭХУ ФАБРЫКІ і іх здольнасьць выканаць ускладзеныя на іх адказьнейшыя задачы. па пасьпяховым правядзеньні сяўбы ў прыгараднай гаспадарцы будзе вымярацца ня колькасьцю рэзалюцый і дэкляраций, а канкрэтнымі справамі, гатоўнасьцю каапгасу і самымі вынікамі сяўбы.

Уся ўвага павінна быць зараз накіравана на хутчэйшае скапчэньне вывазкі ўгнаеньня. Тут нараду з рацыянальным скарыстаньнем транспарту самой гаспадаркі павінен быць мабілізаван і транспарт фабрыкі.

Неабходна прыняць тэрміновыя меры для поўнага ўкамплектаваньня каапгасу рабочай сілай, складаньня вытворчага пляну і разьбіўкі рабочых па брыгадах, правесьці ўсе неабходныя мерапрыемствы па палепшаньні сацыяльна-бытавога становішча рабочых каапгасу, для разгортваньня палітвыхаваўчай і партмасавай работы. Кожны рабочы гаспадаркі павінен быць уцягнут у сацспаборніцтва і ўдарніцтва Тут шырокае поле дзейнасьці і для фабкому фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі», які павінен практычна дапамагчы рабочкому каапгасу разгарнуць масавую работу па мабілізацыі рабочых на ўзорную падрыхтоўку да гародняй сяўбы.

І. Ліпнік.

Для насьценгазэты няма часу.

ЯЛАГІНСКІ СЕЛЬСАВЕТ (па тэлефоне ад нашага спэкора).

Парт'ячэйка каапгасу „Новы шлях" ігнарує пастанову гаркому КП(б)Б па пытаньні кіраўніцтва нізавым друкам. Да гэтага часу нявылучаны партарганізатар, насьценгазэта ўжо напалову з сарванымі заметкамі, не выпускаецца больш месяца. Рэдкалегія няздольна забясьпечыць разгортваньне бальшавіцкай самакрытыкі.

Сэкратар парт'ячэйкі Жаваранкаў усё гэта тлумачыць адсутнасьцю часу. Гарком КП(б)Б павінен прыняць самыя рашучыя меры.

Азаронак.

Рудакоў застойвае кулака.

(Ліст рабочага каапгасу).

У каапгасе «Білева» і да гэтага часу знаходзіцца шкоднік Гарвітоўскі Пятрок, былы эксплёататар, шалёны агітатар супроць калгаснага будаўніцтва. Гарвітоўскі мае ўласнага каня, карову і дробную жывёлу, корміць іх сенам з каапгасу. У мінулым годзе ён самачынна на полі каапгасу запахаў ячмень.

Ня дзіўна, што шкоднік застаўся ў гаспадарцы, што старшыня рабочкому Рудакоў яго застойвае „як добрага гаспадара", бо Гарвітоўскі яму на працягу некалькіх год насіў малако.

Трэба прыцягнуць да адказнасьці старшыню рабочкому, а кулака выкінуць з каапгасу.

Жылінскі.

Ход закладкі парнікоў па каапгасах

па становішчы на 13-е красавіка.

НАЗВА КААПГАСАЎ	Вызначана па пляне	Закладзена	Зашкіравана	Засеяна
Імя Молатава	500	350	492	350
Імя МОПР	200	275	275	210
„Церасполь"	1000	819	1000	514
„Яноўка"	8000	5000	7400	3078
„Новы шлях"	250	252	252	222
„Тулава"	250	200	250	200
Імя Пар. камуны . . .	1500	372	460	261
Каапгас шчоткамбінату	300	246	250	90
РАЗАМ	12000	7514	10379	4925

ЧОРНАЯ ДОШКА.

За зрыў закладкі парнікоў заносім на чорную дошку наступныя каапгасы:

Імя «Паркамуны»—дырэктар каапгасу Гарняк.

Шчоткамбінату — дырэктар каапгасу Далгаполаў.

«Яноўка» — дырэктар каапгасу Сідараў.

«Церасполь» — дырэктар каапгасу Землякоў.

З сарака дзён—дваццаць пайшлі на шуміху і барабанны бой таму, што на чале фабрыкі—„башмакі“.

АРГАНІЗАЦЫІ ФАБРЫКІ ІМЯ КІМ ЗАСЛАНІЛІСЯ АД ПРАКТЫЧНЫХ СПРАЎ НІКОМУ НЕ ПАТРЭБНЫМІ ДЭКЛЯРАЦЫЯМІ.

Калдагаворная кампанія на панчошнай фабрыцы імя КІМ скончылася. 9 красавіка адбылася агульнафабрычная канферэнцыя па заключэньні новага калдагавору. Ці здолелі фабрычныя арганізацыі ператварыць гэту важнейшую гаспадарча палітычную кампанію ў магутны вагар па выкананьні колькасных і якасных паказчыкаў прамфінпляну?

„У мэтах рэалізацыі рашэньняў студзеньскага аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) і баявой падрыхтоўкі да 1-га мая аб асваеньні абсталяваньня вытворчасьці і выкананьня прамфінпляну па колькасных і якасных паказчыках, трыкутнік фабрыкі і калектыў КСМ аб'яўляюць з 20 сакавіка па 1 мая саракадзённы паход па якасьці прадукцыі і аўладаньні тэхнікай“. Пад такой шырокавяшчальнай рэклямай выступілі ў паход за якасьць і аўладаньне тэхнікай трыкутнік і калектыў КСМ фабрыкі

За час паходу фабрыка павінна была дабіцца выкананьня прамфінпляну ня ніжэй 100 проц., давёўшы ўгар па мотальным цэху да 0,25 проц., па вязальным—захаваную штопку давесьці да 25 проц., штопку-брак—да 0,25 проц. і строга прытрымлівацца стандарту, па швэйна-кецельным—давесьці штопку да 0,2 проц...

Сёньня мінула 20 дзён паходу і можна ўжо сказаць, што прынятых абавязацельствы засталіся голай дэкларацыяй і пустазвонствам.

За сакавік мотальны цэх выканаў плян на 99,4 проц., угар прадзева 32/1—0,9 проц., а па прадзеву 32/2—0,2 проц. (па ўмовах паходу ўгар павінен быў быць даведзен да 0,25 проц.), перамотка—2,7 проц. супроць 1 проц. па пляне, па вязальным цэху плян выканан на 69,6 проц., штопка-брак—0,7% (па ўмовах паходу—0,25 проц.), па швэйна-кецельным цэху плян выканан на 72,8 проц., замест плянавых 3 проц. браку маецца 3,16 проц., па фарбарна-апратурным плян выканан на 77 проц., бракаваных вырабаў 37,9 проц супроць плянавых 20. Вось тыя «паказчыкі», якіх гора-кіраўнікі дабіліся за час паходу, за час калдагаворнай кампаніі.

Нягледзячы на тое, што на фабрыцы работае многа маладых работніц, якія нядаўна прыйшлі з вёскі і ня ведаюць машын і што фабрыка мае вельмі дрэнныя паказчыкі па якасьці прадукцыі, дадзеныя абяцаньні аб наладжваньні работы тэхнічных гурткоў, ахопу ўсіх тэхвузлобай, арганізацыі тэхнічнага бою і г. д—засталіся пустой фразай. Ніводзін тэхнічны гурток на фабрыцы не работае. Замест таго, каб дапамагаць новым работніцам у асваеньні машын, наладжваньні іх у час работы, часта можна бачыць мэханікаў, блытаючыхся бяз справы па калідорах.

Зусім дрэнна пастаўлена на фабрыцы падрыхтоўка кадраў. Так, у вязальным цэху для «набыцьця кваліфікацыі» новых работніц прымацавалі да малакваліфікаваных работніц. Аб гаспадарчым разрахунку і гаворыць няма аб чым. Вось, прыкладна, з мотальнага цэху прадзева прывозіцца ў вязальны бяз вучоту і вагі, за няўстойку мотальны цэх не аплачвае, прадзева прывозіцца ў бруцным выглядзе, сырым, пакрытым цьвіллю, перамотка, якая прыбывае з мотальнага цэху ад выпадаў вязальнага цэху таксама брудная. Зусім не вядзецца вучот угару і перамоткі.

Фабрыка—у прарыве. Фабрычныя арганізацыі не ажыцьцявілі рашэньняў студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б), не скарысталі калдагаворную кампанію для мабілізацыі работніц і ІТР фабрыкі на выкананьне колькасных і якасных паказчыкаў прамфінпляну, на асваеньне новага прадпрыемства і новай тэхнікі.

Фабрыка мае ўсе магчымасьці выканаць прамфінплян па ўсіх яго паказчыках. Аб гэтым сьведчыць работа асобных гаспразрахунковых брыгад і ўдарнікаў. Нягледзячы на тое, што цэхі ганебна адстаюць, гаспразрахунковая брыгада тав. Княжышча (вязальны цэх) выканала плян за другую дэкаду сакавіка на 102 проц., давёўшы штопку разам з захаванай да 24,4 проц. супроць плянавых 30 проц., штопку-брак—замест 63 дзесяткаў—да 36-ці, паломка голак—замест плянавых 2115—да 1048; брыгада Бульбянковай плян выканала на 105,5 проц., штопка—20 проц. замест плянавых 30 проц., штопка-брак 9 дзесяткаў замест плянавых 26, паломка голак 356—супроць 898 па пляне.

Такіх брыгад, якія сыстэматычна перавыконваюць свой прамфінплян па колькасных і якасных паказчыках, на фабрыцы многа. А фабрыка адстае. І адстае яна таму, што на чале яе не кіраўнікі, а «башмакі», якія прыбрыліся прыгожай фразай.

А прыгожых фразі добрых абяцаньняў мала. Патрэбна, каб фабрычныя арганізацыі, закасаўшы рукавы, сапраўды па-бальшавіцку ўзяліся-б за ўжыцьцяўленьне ўсіх пунктаў новага калдагавору і рабочых прапаноў, каб яны самі змагаліся за выкананьне ўсіх умоў па абвешчаным імі ж саракадзённым паходзе з тым, каб гадавіну сацспаборніцтва і ўдарніцтва і міжнароднае пралетарскае сьвята 1 мая сустрэць вытворчымі перамогамі.

А. Іофінаў.

ПРЫМУСІЦЬ СУВЯЗЬ ПРАЦАВАЦЬ ПА-БАЛЬШАВІЦКУ.

ЯШЧЭ РАЗ АБ РАБОЦЕ АДДЗЕЛУ СУВЯЗІ.

Скаргі падпісчыкаў газэт, асабліва «Віцебскага пралетара», і атрымліваючых карэспандэнцыі і лісты на зусім невыстарчальную, нават агіднейшую часта работу пошты, асабліва ў справе дастаўкі,—вельмі частае ў нас, у Віцебску і нават ужо быццам «узаконенае» зьявішча. Падпісчык пачынае скардзіцца лістаносцу, той часьцей за ўсё адмахваецца ад вазольных прыставаньняў, альбо дае зусім невычарпальны адказ. Падпісчык накіроўваецца ў газэтнае бюро. Бывае, што яго тут нават і ня выслухаюць. А калі і выслухаюць, запішуць яго адрас, часам нумар квітанцыі, то... на гэтым справа і заканчваецца. Газэты, як і раней, падпісчык атрымлівае неакуратна.

Нельга тут гаварыць выключна аб дастаўцы лістоў і газэт. Невыстарчальна працуе тэлефонная станцыя, асабліва міжгародняя На скаргі па тэлефоне ні кіраўнікі аддзелу сувязі Акімаў, Гарадвёў і інш., ні старэйшыя тэлефаністкі ў пераважнай большасьці не рэагуюць.

Справа яшчэ і ў тым, што гэтыя скаргі не зьяўляюцца выпадковымі, а носяць сыстэматычны характар, значыцца. невыстарчальнасьць у рабоце аддзелу сувязі ёсьць сыстэма яго работы.

У час загатоўчай кампаніі мелі месца выключна абурачыя факты (несваечасовая дастаўка ўрадавых тэлеграм, маланак, частыя зрывы важнейшых размоў, дрэннае прасоўваньне бюлетэня «Віцебскага пралетара» ў калгасы і інш.). Здаецца, што гэтыя факты і паказаньні гаркому партыі па гэтых справах павінны былі быць для кіраўніцтва канторы сувязі суровым урокам таго, як павінна спраўляцца са сваімі задачамі наша савецкая сувязь.

Надыйшла веснавая пасеўная. Посьпех сяўбы залежыць ад апэрацыйнага кіраўніцтва гарадзкіх і цэнтральных арганізацый. Але бяз чотка і зусім выстарчальна працуючых галін сувязі нельга зьдзейсьніць гэтае апэрацыйнае кіраўніцтва. Ад таго, наколькі будзе добрай тэлефонная і тэлеграфная сувязь, наколькі хутка будуць дастаўляцца весткі аб сяўбе, карэспандэнцыі і лісты ў „Віцебскі пралетары“, наколькі хутка палітычны орган гаркому партыі „Віцебскі пралетары“ будзе даходзіць да масы калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў,—будзе залежыць апэрацыйнае кіраўніцтва сяўбой з боку гарадзкіх арганізацый, будзе ў значнай ступені залежыць лёс самой сяўбы

Зьмяшчаемыя сёньня лісты і скаргі падпісчыкаў і поштаатрымацеляў зьяўляюцца сыгналам кіраўніцтву віцебскага аддзелу сувязі.

Зусім правы тав. Карчэўскі, які зьдзіўляецца, чаму ён адначасова атрымлівае маскоўскія газэты і «Віцебскі пралетары» за мінулы дзень.

Абураюча недапушчальным зьяўляюцца факты продажу газэт падпісчыкаў лістаносцам Калініным (Замастоцкі сельсавет) на макулятуру.

Факты зьнішчэньня сельскораўскіх допісаў на пошце Рудніцкага сельсавету сыгналізуюць аб тым, што там дзейнічае клясавы вораг, альбо яго агент.

Мы патрабуем неадкладнага дзелавога і хуткага рэагаваньня на факты, прыводзімыя ў зьмяшчаемых сёньня лістах. Але гэта толькі адзін бок справы.

Сёньня работа апарату сувязі зусім нездавальняюча. Мы патрабуем ад кіраўніцтва і партыйнай ячэйкі віцебскага аддзелу сувязі прыняцьця ў бліжэйшыя дні сапраўды бальшавіцкіх мер, якія-б забясьпечылі чоткую і выстарчальную работу ўсіх галін апарату сувязі, асабліва па абслугоўваньні веснавой пасеўнай кампаніі.

Газэты падпісчыкаў прадаюцца на макулятуру.

Лістаносец Замастоцкага сельсавету Калінін вельмі дрэнна і нават злачынна адносіцца да выкананьня сваіх абавязкаў Шмат падпісчыкаў скардзяцца, што газэты выпісваюць, грошы плоцяць, а чытаць ня прыходзіцца таму, што Калінін штодзённую газэту дастаўляе падпісчыкам толькі раз у тыдзень і то незаўсёды, чым зрывае вярбоўку новых падпісчыкаў. Калі падпісчыкі заяўляюць яму аб гэтым, ён кажа, што быццам яму газэт не дасылае горад, а між тым, цэлымі пачкамі носіць газэты і прадае іх Замастоцкай краме сельСТ.

Калгасьнікі калгасу «М. Чэрніца» падпісаліся на газэты ў віцебскім газэтным аддзеле, спадзяючыся ўжо напэўна атрымаць іх, але і на гэты раз не атрымалі. Лістаносец Калінін тлумачыць ім гэта тым быццам аддзел сувязі не даслаў яму картак на гэтыя газэты.

Балткоў Т.

Калгас „М. Чэрніца“,
Замастоцкі сельсавет.

У рудніцкай пошце зьнішчаюць селькораўскія допісы.

Пошта Рудніцкага сельсавету зусім ігнаруе друк. Сельсавет знаходзіцца ў 12-ці кілёмэтрах ад гораду і газэту „Віцебскі пралетары“, якая выходзіць а 7-й гадзіне раніцы, можна прывезьці да 12 гадзін дню і да вечара разьвесьці па калгасах. Але-ж „Віцебскі пралетары“ наш чытач бачыць толькі на трэці дзень пасьля выхаду нумару. Калгас імя Дзяржынскага, вёскі Цішкава, Паўлаўшчына атрымліваюць газэту пачкамі, за цэлы тыдзень разам Маюцца выпадкі адмаўленьня ад падпіскі з-за дрэннай дастаўкі нягледзячы на тое, што ў калгасе імя Дзяржынскага вылучаны сталы лістаносец Чычэніка Н, якая атрымлівае працадні, газэты яна не разносіць.

На Рудніцкай пошце маюцца нават выпадкі зьнішчэньня селькораўскіх лістоў, але сельсавет на ўсё гэта не рэагуе. Трэба праверыць работу Рудніцкай пошты.

Селькор.

Газэтнае бюро бязьдзейнічае.

Нягледзячы на ўсю важнасьць своечасовага атрыманьня падпісчыкамі газэт, газэта „Віцебскі пралетары“ атрымліваецца са спазьненьнем на 1—2 дні. Вэтрабфак падпісаўся на 50 экземпляраў, а атрымлівае толькі 45 і то са спазьненьнямі. На неаднаразовыя звароты да загадчыка газэтнага бюро, апошні нават і адказваць ня хоча. Трэба прыняць усе захады, каб зьнішчыць гэтыя недахопы ў рабоце газэтнага бюро.

Студэнт вэтрабфаку Селязьнёў.

* * *

Трэба адзначыць дрэнную дастаўку лістаносцамі газэты „Віцебскі пралетары“. Нягледзячы на неаднаразовыя звароты са скаргамі, я не атрымаў газэты і з 1 па 6 і з 18 па 27 студзеня. Гэта-ж паўтарылася ў лютым і сакавіку.

Семянідаў.

* * *

Я жыву на Пескавацках і атрымліваю газэту ня штодзённа і па 3 экзэмпляры адразу, з прычыны чаго не магу скарыстаць свой вольны час для таго, каб кожны дзень акуратна чытаць газэту. Трэба прыняць належныя меры, каб рабочыя атрымлівалі газэты штодзённа.

Амануэль.

* * *

Абслугоўваньне насельніцтва гораду Віцебску аддзелам сувязі пастаўлена зусім дрэнна. Пошта да гэтага часу не перабудавала сваёй работы. Часта знаходзяць лісты і газэты, падкінутымі пад дзьверы кватэр, у якіх зусім ня жыве адрасат. Так, было, напрыклад, па Замкавай вул., № 7. Вінаватых у расхіваньні лістоў і газэт трэба прыцягнуць да суровай адказнасьці.

М. Е. Арава.

...„А „Віцебскі пралетары“ я атрымоўваю праз дзень“.

З Масквы газэты, лісты і карэспандэнцыі ў Віцебску атрымліваюцца на другі дзень пасьля іх адпраўленьня. А вось чаму газэту «Віцебскі пралетары» ў Віцебску я атрымліваю на другі дзень пасьля яе выпуску, аднолькава як і маскоўская?

Я лічу, што гэта зьявішча ненармальнае і таму прашу даць мне адказ, чыя тут віна.

Карчэўскі

Ленінская, 35, кв. № 8,
амаль супроць самой пошты.

НЕПАВАРОТЛІВАСЬЦЬ І ФАРМАЛІЗМ КІРАЎНІЦТВА ДРУКАРНІ.

(Ліст рэдактара шматтыражкі).

У № 20 (283) шматтыражкі «Сьцяг індустрыялізацыі», які знаходзіўся ў наборы 9 красавіка і вярстаўся 10-га, павінны былі быць зьмешчаны два рабкораўскіх допісы на польскай мове па пытаньні аб рабоце фабрычнай школы пісьменных і малапісьменных. Нягледзячы, аднак, на тое, што гэтыя допісы былі намі здадзены ў друкарню для набору на два дні раней калядарнага пляну, 7 га красавіка, допісы ўсё ж ня былі друкарняй набраны.

На наш рашучы пратэст, загадчык наборным цэхам друкарні т. Аксельрод даў бюракратычны адказ: „Нічога не маў зрабіць“, і ня прыняў ніякіх мер, каб допісы былі набраны.

Гэты выпадак, калі па віне друкарні зрываецца друкаваньне матар'ялаў на мовах нацменшасьцяў, у прыватнасьці на польскай, ня першы і яшчэ раз сыгналізуе аб тым, што з боку кіраўнікоў друкарні існуе яўна апартуністычная недаацэнка вялікай палітычнай важнасьці камуністычнага друку на нацыянальнай мове.

Мы зварачваемся да гаркому КП(б)Б з просьбай рэагаваць на недапушчальныя адносіны друкарні да друкаваньня матар'ялаў шматтыражкі на мовах нацменшасьцяў і прыняць меры, каб надалей друкарня ня зрывала нам работу.

Адказны рэдактар шматтыражкі
«Сьцяг індустрыялізацыі» І. Ліпнік.

АД РЭДАКЦЫІ. Ліст т. Ліпніка выкрывае тое, што хвалюе ўсіх рэдактароў шматтыражак гораду. Непаваротлівасьць і фармалізм нават пры больш важных палітычных заданьнях характарызуе адносіны кіраўніцтва друкарні да шматтыражак. Зрыў набору зьместаў на мовах нацменшасьцяў меў месца гэтымі днямі і па шматтыражцы „Чырвоная акулярніца“.

Мы ўпэўнены, што сэктар друку ГК партыі прыме безадкладна самыя рашучыя меры, якія забясьпечаць шматтыражкам абслугоўваньне рабочых на іх роднай мове.

Друкарня „Камінтэрн“, бальшавіцкая, 10.

ЗА ГРАНІЦАЙ

Распад германскай сацыял-дэмакратыі.

БЭРЛІН, 11. Пад загалоўкам «Распад сацыял дэмакратыі». „Самароспуск партыі“ «Бэрлінэр фольксцэйтунг» зьмяшчае сёньня на відным месцы наступнае паведамленьне:

«На працягу апошніх тыдняў унутры сацыял-дэмакратычнай партыі намячаюцца вельмі вялікія тэндэнцыі да распаду. Шматлікія выдатныя члены партыі, паколькі яны не належалі непасрэдна партыйнаму кіраўніцтву, пакінулі ў апошні час партыю. Да таго-ж асобы, зьяўляючыяся да сучаснага моманту афіцыйнымі правадырамі, аказаліся ў сваёй большай колькасьці вельмі дыскрэдытаванымі і часткай паўцякалі, так што для кіраўніцтва партыі яны ўжо страчаны.

Побач з Отто Браўнам Гржэзінскі, Гейльман і, па-ўсёй магчымасьці, таксама Брэйтшэйд канчаткова адышлі ад кіраўніцтва. Гільфэрдзінг таксама ня будзе больш граць ніякай ролі.

Асабліва стаіць пытаньне аб лёсе забароненых партыйных газэт. У гэтыя газэты большая колькасьць якіх мае ўласныя друкарні, укладзены вялікі капітал. Справа ідзе аб тым як выратаваць гэтыя ўклады. Спадзяюцца, што в дазволу ўраду ўдасца выдаваць нейтральныя газэты мясцовага маштабу.

Пануючае ў шырокіх колах пралетарыяту нездавальненьне партыйным кіраўніцтвам павяло амаль да поўнага спыненьня партыйных узносаў. У сучасны момант амаль немагчыма пабудзіць членаў партыі да ўплаты членскіх узносаў Ужо па аднаму гэтаму партыя рана ці позна пацярпела-б на сабе цяжкія фінансавыя затрудненьні і была б вымушана ўжо па гэтай прычыне адмовіцца ад далейшага існаваньня».

Герынг прызначаны намесьнікам Прусіі.

БЭРЛІН, 11. Па вестках вячэрняга выданьня «Дэйчэ альгемэйнэ цэйтунг», Гітлер у якасьці імпэрскага намесьніка ў Прусіі, якім ён зьяўляецца па сумяшчэньні па законе ад 7-га красавіка, прызначыў Герынга прэм'ер-міністрам Прусіі.

* * *

БЭРЛІН, 11. Вячэрні друк падцьвярджае меркаваньні аб фактычным адхіленьні фон-Папэна ад удзелу ў паўсядзённай унутранай палітыцы. Газэты паведамляюць аб ускладаньні на Папэна начэснай місіі па прадстаўніцтве Германіі за мяжой, і што ён яшчэ да сваёй паездкі ў Рым падаў рэйхспрэзыдэнту заяву з просьбай аслабаніць яго ад абавязкаў імпэрскага камісара ў Прусіі.

Друк дадае, што рэйхспрэзыдэнт выканае просьбу фон Папэна аб чым тэлеграфна паведаміць яго ў Рыме.

Масавыя вобыскі і арышты ў сувязі з Першым мая.

ВІЛЬНЯ. Віленская манархічная газэта «Слово» паведамляе, што ў сувязі з надыходзячым міжнародным сьвятам рабочых—Першае мая ў Варшаве адбыліся масавыя вобыскі і арышты. 7 красавіка ноччу паліцыя зрабіла налёт на рабочыя кварталы і арыштавала 116 чалавек. Таксама адбываюцца масавыя арышты і на правінцыі, асабліва на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Так, у паветах Сьвянцянскім, Пастаўскім, Браслаўскім і Дзісьненскім адбыліся масавыя вобыскі і арышты сярод працоўнага сялянства. Шмат сялян арыштавана. У мястэчку Відзы, Браслаўскага павету, зроблены масавыя вобыскі, арыштавана 18 чалавек.

УСЕ ВЯЗЬНІ СКОТЗБОРО ПРЫГАВОРАНЫ ДА КАРЫ СЬМЕРЦЮ.

БЭРЛІН, 10. У сваім вячэрнім выданьні «Бэрлінэр тагеблят» зьмяшчае тэлеграму з Алабамы (ПАЗШ), што ўсе 7 вязьняў Скотсборо прыгавораны да кары сьмерцю на электрычным стуле.

МОПР мабілізуе масы на выратаваньне вязьняў Скотсборо.

НЬЮ-ЁРК. 10. Сьмяротны прыгавар, вынесены вязьням Скотсборо, выклікаў буру нездавальненьня сярод працоўных ПАЗШ. Сотні тысяч нэгрыцянскіх і белых рабочых дэманструюць па заклику МОПР у розных гарадох краіны, пратэстуючы супроць прыгавару.

МОПР арганізоўвае 11 красавіка ў Бастоне, а 12 красавіка ў Нью-Ёрку, масавыя дэманстрацыі пратэсту.

Мітынгі пратэсту склікаюцца па ўсёй краіне. Рухам пратэсту ахоплены таксама шырокія колы лібэральнай інтэлігенцыі. На мітынгу 12 красавіка ў Нью-Ёрку будзе выступаць побач з камуністамі цэлы рад лібэральных дзеячоў.

У Сант-Яга, на высьпе Куба, рабочыя, дэманстраваўшыя супроць абвінавачальнага прыгавару перад амэрыканскім консульствам, выбілі вокны ў будынку консульства.

* * *

ПАРЫЖ, 11. Сэкратарыят францускай сэкцыі МОПР ад імя 45 тысяч членаў заклікае працоўныя масы ўзмацніць барацьбу за ратаваньне нэграў, вязьняў Скотсборо.

Рэвалюцыйныя выступленьні прызыўнікоў у Польшчы.

ВІЛЬНЯ Рост рэвалюцыйнага руху ахапляе ўсё шырэйшыя масы працоўных Польшчы. Нягледзячы на ўсю дэмагогію сацыял фашыстаў, на ўсе іх імкненьні зламаць барацьбу пралетарыяту супроць фашызму, рабочыя і працоўнае сялянства ўсё больш пераконваюцца, што адзіны шлях выхаду з сучаснага становішча—гэта арганізаваная барацьба рабочых і сялян з капіталістамі і сацыял-здрадзікамі розных масьцей.

Хваля масавых забастовак у прамысловасьці па ўсёй Польшчы, забастоўкі батракоў у сельскай гаспадарцы і баявыя рэвалюцыйныя выступленьні сялян цэлых паветаў супроць памешчыкаў, кулакоў і фашыстаў—выразна сьведчаць аб гэтым. Маладыя рабочыя і сяляне, якіх набіраюць у армію для прахаджэньня вайсковай службы, добра ведаюць чые правы прызначана абараняць польская армія і супроць каго будзе яна накіравана ў часе ваенных падзей. З якой ахвотай рабочыя і працоўныя сяляне ідуць адбываць вайсковую службу, сьведчаць выступленьні навабранцаў, якія адбываюцца кожны год у часе прызыву.

Як паведамляе «Дзеньнік Віленскі», цягнік, які ішоў з навабранцамі з Варшавы ў Вільню, спазьніўся на 3 гадзіны. Спазьненьне цягніка адбылося з прычыны выступленьняў ехаўшых у вайсковыя часьці навабранцаў. Навабранцы пачалі ў цягніку сьпяваць рэвалюцыйныя песьні, за што варта, якая суправаджала цягнік, хацела арыштаваць некалькіх навабранцаў. Абураныя навабранцы не далі арыштаваць сваіх таварышоў. Варта паведаміла аб гэтым уладам Беластоку, Малёіна і Горадні (шлях сьледваньня цягніка). У часе астаноўкі на гэтых станцыях цягнік акружылі прыгатаваныя атрады войска, паліцыі і жандармэрыі і пачалі рабіць арышты перадавых навабранцаў.

Навабранцы аказалі супраціўленьне. У выніку адбылася бойка паміж навабранцамі і атрадамі жандармэрыі і паліцыі. Як піша газэта, усе шыбы ў вагонах былі выбіты. Хуткая дапамога адвозіла параненых навабранцаў у горад

На станцыі Горадня цягнік быў акружан моцным атрадам войска, які суправаджаў навабранцаў да самай Вільні. У Вільні прышоўшы цягнік акружылі атрады войска і паліцыі, высадзілі з цягніка навабранцаў, многіх з іх арыштоўваючы. Арыштаваных пад моцнай вартай адправілі ў казармы.

З прычыны апошніх падзей з прызыўнікамі,—піша «Кур'ер Віленскі», урад выдаў загад, каб цягнікі, у якіх будуць ехаць у прызначаныя гарады навабранцы, ахоўваліся спэцыяльнай вартай, назначэньне якой—душыць рэвалюцыйныя выступленьні прызыўнікоў.

Гарадзкі зьлёт рабкораў і рэдактароў шматтыражак і насьценгазэт.

Сёньня, а 6 гадзіне ўвечары ў вялікай залі ГК КП(б Б адбудзецца **гарадзкі зьлёт рабкораў і рэдактароў шматтыражак і насьценгазэт** па пытаньні: „Удзел друку ў веснавой сяўбе і задачы рабкораў“. Дакладчык старшыня гарсавету тав КАРДАШЭНКА.

Пад асабістую адказнасьць сэкратароў ячэек і рэдактароў шматтыражак павінна быць забясьпечана своечасовая яўка на зьлёт рабкораў і рэдактароў насьценгазэт

КУЛЬТПРОП ГК КП(б)Б.

СЁНЬНЯ, А 2 ГАДЗ. ДНЮ, у памяшканьні Палацу працы (пакой № 38), **адбудзецца сход** па пытаньні падрыхтоўкі да дню 1 мая. На сход запрашаюцца ўсе **гурткаводы драматычных, музычных, струнных, духавых і харавых гурткоў,**
кіраўнікі ТРАМ кадраў і актыў самадзейных гурткоў, якія ня маюць кіраўнікоў прафэсыяналістаў.
А 8 гадз увечары г. дню, у памяшканьні Белдзаржтэатру склікаецца актыў самадзейных гурткоў, якія ня маюць кіраўнікоў прафэсыяналаў і працуюць на ранішняй зьмене.
Гарком саюзу прамастацтва.
340—3—1

Віцебскаму кіно-тэхнікуму
ПАТРЭБНЫ ВЫКЛАДЧЫКІ
па сцэнаразнаўстве (180 г. дз.) і тэхналёгіі матэраляў (агульнай і спэцыяльнай).
Заявы накіроўваць: Віцебск, Канатная, 93.
335—2—1

Мясцком, сэкцыя ІТР і адміністрацыя Белтэкстыльтрэсту з глыбокім жалем паведамляюць аб сьмерці галоўнага інжынэр трэсту
т. ШТУЦАРА Ўладзімера Іванавіча,
якая пасьледвала ўначы за 11 на 12 красавіка.
Вынас цела сёньня, 14 красавіка, а 4-й гадзіне, з кватэры па Ніжня Узьбярэжнай, № 23.

Дырэкцыя, бюро калектыву ЛКСМБ, прафком і студэнцтва ВТТ з глыбокім жалем паведамляюць аб заўчаснай сьмерці выкладчыка па праектаваньні фабрык
інжынэра ШТУЦАРА У. І.,
якая пасьледвала 11 красавіка па цяжкай хваробы, і выражаюць спачуваньне сям'і памёршага.

Прыём на 8-МЕСЯЧНЫЯ ПЭДКУРСЫ ПРАЦЯГВАЕЦЦА ДА 20-га КРАСАВІКА.
Заявы прымаюцца ў гарАНА.
318—3—2

Адказны рэдактар Л. РОЗЭНБЛЮМ.